У вершы “Балада аб маці” В.Шымук выкарыстоўвае разнастайныя мастацкія сродкі, каб прыблізіць чытача да рэальных падзей, прымусіць суперажываць галоўнай гераіні верша. Эпітэты (сыны – уцеха, надзея матулі, сэрцы гарачыя, рука пяшчотная), метафары (абдымуць, да сэрцаў гарачых ласкава прытуляць), адухаўленне (і дрэвы прыветна здалёк сустракаюць яе), паўтор страфы дазваляюць стварыць высокую эмацыянальную напружанасць, ператварыць верш у гімн ўсім маці, чые дзеці не вярнуліся з вайны, у гімн Мацярынсту.

Вайна скончылася 70 гадоў назад і стала ўжо гісторыяй, але войны на зямлі ўспыхваюць, не заціхаюць. То там, то тут на планеце плачуць матулі і дзеці, знішчаюцца дамы, ураджайныя палеткі, прыгожыя сады. Знішчаецца жыццё. Чытаючы верш нашага земляка, паэта В.Шымука, пранікаешся нянавісцю да вайны, як антычалавечай з’явы, хочаш зрабіць усё магчымае, каб войны ніколі больш не паўтараліся.

ЛІТАРАТУРА:

1. Шымук, В.М. Святло красавіцкіх бяроз // В.М. Шымук. – Мінск.: Мастацкая літаратура,1983. – 158 с.
2. Шымук, В.М. Спелы жнівень // В.М. Шымук. – Мінск.:Мастацкая літаратура,1990. – 143 с.

## АДНАЎЛЕННЕ ТРАДЫЦЫЙ ВЯЛІКАГА ГАННЕНСКАГА КІРМАША Ў ЗЭЛЬВЕ

УА “Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”
**Мацюк К.І., студэнтка 2 курса лячэбнага факультэта**
Кафедра сацыяльна-гуманітарных навук
Навуковы кіраўнік – канд. гіст. навук, старшы выкладчык Чарнякевіч І.С.

**Актуальнасць працы.** Адраджэнне Ганненскага кірмаша - гэта не толькі экскурс у мінулае Зэльвеншчыны, але і выдатная магчымасць прасоўваць свой турыстычны прадукт на сусветны рынак, ствараючы арыгінальны брэнд.

**Мэта даследавання.** Прааналізаваць патэнцыял свята Ганненскага кірмашаў павышэнні турыстычнай прыцягальнасці Зэльвеншчыны.

**Вынікі.**Зэльвенцы надзвычай беражліва ставяцца да традыцый і старадаўніх звычаяў. Таму святы, якія ладзяцца на нашай зямлі, заўсёды праходзяць вельмі цікава і запамінальна. Жыхары пасёлка могуць пахваліцца тым, што змаглі адрадзіць правядзенне аднаго з самых значных мерапрыемстваў, якія калісьці ладзілася на нашай зямлі – свята “Ганненскі кірмаш”.

Права арганізаваць штогадовы кірмаш атрымалі ўладальнікі Зэльвы князі Сапегі прывілеем вялікага князя літоўскага і польскага караля Аўгуста II Моцнага ад 20 мая 1721г. З гэтага часу Ганненскі кірмаш, названы ў гонар



Репозиторий ГрГМУ

Святой Ганны, адыгрывае значную ролю ва ўнутранным і знешнім гандлі Гродзенскай губерні, а таксама ва ўсім жыцці насельніцтва [3, с. 70].

“Новае дыханне” славуты кірмаш атрымаў ў 2001 годзе, калі ў Зэльвенскім раёне вырашылі, што ўнікальнае свята з магутнымі гістарычнымі каранямі павінна стаць візітнай карткай Зэльвеншчыны, адным з самых масавых і жаданых для жыхароў і гасцей раёна.

На розных мерапрыемствах абласнога і нават рэспубліканскага ўзроўняў Ганненскі кірмаш абмяркоўваецца як адзін з паспяховых праектаў, які праводзіўся, пачынаючы з 2001 года, ў 2002, 2004 і 2010 гг. Пачынаючы з 2012 г., кірмаш праводзіцца кожны год.

За час адраджэння Ганненскага кірмаша з’явілася шмат новых традыцый.

Адзін з яго творчых праектаў – “Кірмаш рамёстваў”– стаў сапраўдным брэндам. З кожным годам маштаб яго правядзення становіцца ўсё больш значным.

–Асноўная мэта “Кірмашу рамёстваў”, – адзначыла адзін з яго арганізатараў, дырэктар раённага Дома рамёстваў Ала Сідорык, –захаванне і папулярызацыя народнай творчасці праз прыцягненне ўвагі моладзі да мастацкай спадчыны. “Кірмаш рамёстваў” мы задумалі як адно з абавязковых мерапрыемстваў Ганненскага кірмаша і спадзяёмся, што на яго заўсёды будуць з’язджацца рамеснікі і народныя майстры з розных рэгіёнаў нашай краіны, а ў перспектыве, магчыма, і з замежжа [2, с.4].

Выстава вырабаў народных умельцаў падчас Ганненскага кірмаша стала сапраўдным цэнтрам прыцягнення для тысяч гараджан і гасцей свята.

Здаўна ніводзін кірмаш не абыходзіўся без спартыўных баталій. На сённяшні дзень у рамках свята праходзяць спаборніцтвы па сумо і сілавому экстрыму,падчас якіх вызначаюць самага моцнага івынослівага жыхара раёна. Упершыню ў 2015 годзе прайшлі міжнародныя спаборніцтвы па шатакан каратэ-до. Удзел у спаборніцкім супрацьстаянні «Усход-Захад» прынялі спартсмены з Расіі, Беларусі і Латвіі [4, с. 3].

Хочацца верыць, што міжнародныя матчавыя сустрэчы і спаборніцтвы, прымеркаваныя да кірмаша, у далейшым стануць добрай традыцыяй на Зэльвеншчыне.

А які ж кірмаш без коней?! Здаўна конь быў сімвалам Ганненскага кірмаша. У маштабе свята яму адводзіцца асаблівая роля. Ён з’яўляецца галоўнай фігурай конна-спартыўных праграм, якія праходзяць на стадыёне пасёлка. За гады правядзення свята былі прадстаўлены паказальныя выступленні выхаванцаў бераставіцкай, ваўкавыскай, лідскай конна-спартыўных школ [1, с. 4].

Удзельнікі свята маюць магчымасць праехацца на брычках, паўдзельнічаць у конкурсе на самую прыгожую павозку, паназіраць за выступленнем прадстаўнікоў конна-спартыўных школ, палюбавацца выстаўленымі ў свободным выгуле ў паркавай зоне коньмі мясцовых сельгасарганізацый. З гэтага года вернуты коныя таргі – першапачатковае прызначэнне гэтага кірмаша.

Падчас Ганненскага кірмаша склалася добрая традыцыя праводзіць конкурсы: каравааў, “стылізаванага касцюма”, афармлення балкона ў стылі 18 ст., работ дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, фотаздымкаў і відэасюжэтаў на тэму “Ганненскі кірмаш”. У 2014 годзе ўпершыню прайшлі конкурсы аматараў рыбнай лоўлі і прыгатавання юшкі.

Па водгуках мінулагодніх свят пэўны інтарэс у людзей выклікаюць падворкі сельвасетаў і сельскагаспадарчых арганізацый, якія размяшчаюцца на цэнтральнай плошчы пасёлка. Гаспадары шчыра запрашаюць ўсіх жадаючых зайсці да іх на падворак, дэманструюць традыцыйныя прадметы хатняга абіходу, забаўляюць народнымі гульнямі, песнямі і танцамі.

У рамках кірмаша штогод арганізоўваюцца навукова-практычныя канферэнцыі. Абмеркаваць актуальныя для нашага раёна пытанні за «круглым сталом» збіраюцца краязнаўцы і даследчыкі, навукоўцы і выкладчыкі з Мінска, Гродна, Брэста і Ваўкавыска.

**Вывад.** Правядзенне Ганненскага кірмаша адыгрывае вялікую ролю ў фарміраванні іміджу раёна і развіцці турызму. Свята нібы запрашае гасцей з усяго свету наведаць Зэльвеншчыну, пазнаёміцца з яе жыхарамі.

ЛІТАРАТУРА:


1. Бебех, Дз. Кірмаш без коней – не кірмаш / Дз. Бебех// Праца. – 2012. –19 вер.
2. Попка, Л. Город мастеров/ Л. Попка // Праца. – 2012. – 24 вер.
3. Швед, В. Ганненскі кірмаш у Зэльве / В. Швед // Памяць. Зэльвенскі раён. – Мінск., 2003. – С. 69–73.
4. Шумович, А. Впервые в Зельве команды условных Востока и Запада боролись за победу в каратэ/ А. Шумов// Праца. – 2015. – 16 вер.


## ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ Ў ТРЫЛОГІІ ЯКУБА КОЛАСА “НА РОСТАНЯХ”, ІХ КЛАСІФІКАЦЫЯ


УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»

**Сільвановіч А.Г., студэнт 1 курса лячэбнага факультэта**

Кафедра рускай і беларускай моў

Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.


Трылогію Якуба Коласа “На Ростанях” можна назваць энцыклапедыяй жыцця беларусаў. І гэта невыпадкова, бо пісьменнік з’яўляецца выдатным знаўцам жыцця сялянства, іх дум і імкненняў. У трылогіі мы назіраем глыбокую народнасць мовы, насычанасць фразеалагізмамі, прыказкамі і прымаўкамі, трапнымі народнымі выслоўямі, крылатымі словамі і афарызмамі.

Прыказкі і прымаўкі ў трылогіі складаюць вялікую групу, іх налічваецца каля 300. Зарыфмаваныя прыказкі робяць мову персанажаў больш афарыстычнай, дапамагаюць аўтару сцісла і вобразна выказваюць сваю думку. Сярод іх сустракаюцца і агульнавядомыя, і малавядомыя. Напрыклад: “Чакай,



Репозиторий ГрГМУ